ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ЧАЦВЕР
26
СНЕЖНЯ
№ 33—34
(1695—1696)

ФОТАПОЗІРК У ГОД МІНУЛЫ

Дзякуй і бывай...

Перад тым, як звярнуцца з пажаданнямі да надыходзячага года, мы заўсёды аддаем удзячны рытуал мінуламу. У апошні час гэты рытуал усё скарачаецца, нават ёсць пагроза, што ён знікне наогул.

Цяжка будзе вымавіць 31 снежня надвячоркам «Дзякуй!» 1991 году. Такімі крывава-чорнымі былі некаторыя яго дні і ночы ў Вільнюсе і Нагорным Карабаху, такім напружаным мітынговы красавік у Мінску, такім выпрабавальным жнівень і такім балючым развітанне з апошнімі ідэаламі мінулага...

Значыць, падзякуем яго толькі за тое, што ён, нарэшце, пакіне нас, захапіўшы з сабою жахі, якія прынёс? Але ж няма больш на зямлі нікога з такім бясконцым цяжарам, як мы на ўсім працягу нашай гісторыі. Раптам у гэтым — незвычайная велічынь нашай будучай, абавязкова вышэйшай, місіі на свеце?

Усё ж — дзякуй! За нас новых. За «Бывай!», якое мы здолелі вымавіць таму, без чаго не ўяўлялі сябе зусім нядаўна: СССР, КПСС, «сацыялістычным» цэнам, старым назвам і былому гонару... За былыя расчараванні і новыя спадзяванні. За тое, што мы здольны яшчэ ўсміхацца і кахаць адзін аднаго!

Фота Сяргея ГРЫЦА.

«На месца Леніна я б нікога не паставіў...»

9 снежня па рашэнню Мінгарвыканкома плошча Леніна была перайменавана ў плошчу Незалежнасці. Як ставяцца да гэтага людзі? Ці сумяшчальныя паняцці незалежнасці і дыктатуры, якая для многіх увасабляецца ў постаці Леніна? Каго можна было б паставіць на п'едэстал замест яго?

С. КУРСАНАВА, студэнтка:

— З Леніна сапраўды зрабілі ідала. Трэба канчаць з гэтым. Плошча павінна насіць імя славутай нацыянальнай асобы.

Н. СІНІЦА, студэнтка:

— Лепш позна, чым ніколі. Хоць на фоне тых смелых перайменаванняў, якія ўжо ажыццяўлены, гэта падзея выглядае не кідка і не так хвалюе розум і душу. Карацей, радавая падзея, аб якой многія, пэўна, яшчэ і не ведаюць, бо ўвесь грамадскі транспарт рухаецца ў адпаведнасці з маршрутам, у якім засталіся старыя назвы.

Ю. ЛЯШКЕВІЧ, студэнт:

— Маё меркаванне некаму падасца кансерватыўным. Але я лічу, што помнік Леніну на плошчы Незалежнасці кранаць не трэба. Гэтым мы не закрэслім 74 гады нашай гісторыі. Тым больш, што калі сталіца СНД пераносіцца ў Менск, няхай хоць тут застанецца помнік Леніну. Амерыканцы кажуць: «Няхай мая краіна дрэнная, але гэта мая краіна». Вось і я кажу: няхай наша гісторыя дрэнная, але гэта ўсё роўна наша гісторыя.

І. УРЫМАГАЎ, вадзіцель тралейбуса:

— Успомнілі пра незалежнасць...

Хіба мы, беларусы, ведаем, што гэта такое? Лепш назвалі б плошчу проста Цэнтральная.

Л. ФІНДЗЮКЕВІЧ, міліцыянер:

— Незалежнасць — гэта добра, але наконт дыктатуры Леніна я думаю інакш. Праўда, гаварыць сёння пра Леніна добра не прынята, не модна. А па сутнасці, чым дрэнныя яго ідэі? Хто можа прапанаваць што-небудзь лепшае? Ленін нікому не перашкаджае, і разбураць помнік яму не трэба, а тым больш апаганьваць, як гэта робіцца паўсюдна.

А. ПУРТАЎ:

— Помнік гэты — наша гісторыя. Пакаленні павінны ведаць, хто такі Ленін, хто стварыў нашу сістэму. У адрас Леніна пастаянна нясуцца праклёны, а я б нікога больш не паставіў на яго месца.

Распытвалі
Э. ШЛЯГА і
А. ХАРЫТОНАВА.

«Быць фізікам добра, бухгалтарам лепш...»

ТАК КАНСТАТАВАЛІ ў Рэспубліканскім цэнтры занятасці насельніцтва пры Дзяржаўным камітэце па працы. Адыходзячы 1991 год прынёс нам афіцыйнае, заканадаўчае прызнанне беспрацоўя. На студзень зарэгістравана 1.592 чалавекі, якія па розных прычынах аказаліся без работы. 1.107 з іх атрымліваюць сацыяльную грашовую дапамогу. Наогул жа каля 15 тысяч грамадзян Рэспублікі Беларусь былі ўзяты на ўлік як патрабуючыя працаўладкавання. Бясстрасная статыстыка сведчыць: вызначылася ўстойлівая тэндэнцыя скарачэння колькасці занятых у народнай гаспадарцы, асабліва на дзяржаўных прадпрыемствах (71 працэнт) хоць рыначныя адносіны яшчэ не ўздзейнічаюць.

Што год надыходзячы нам рыхтуе? За прагнозам-92 рэдакцыя звярнулася да вядучага спецыяліста Цэнтра занятасці Надзеі Іванаўны РАМАНАВАЙ.

— *Агульнавядомая ісціна: сярод беспрацоўных асноўную большасць складаюць жанчыны і маладыя спецыялісты, нядаўнія выпускнікі ВНУ. Але давайце канкрэтызуем у лічбах.*

— Негалоснае першынство сапраўды ўтрымліваюць нядаўнія выпускнікі. Але не абавязкова ВНУ. За 4 месяцы існавання Цэнтра да нас звярнуліся за дапамогай па працаўладкаванню 1.479 чалавек, якія сёлета закончылі сярэднія спецыяльныя прафтэхвучылішчы, 798 — сёлетнія выпускнікі тэхнікумаў і 720 — выпускнікоў ВНУ. З іх працаўладкаваны адпаведна 946, 429 і 314 чалавек, прызнаны беспрацоўнымі 47,80 і 184 чалавекі. Як бачым, колькасць тых, каму не змаглі дапамагчы знайсці работу пасля ВНУ, сапраўды найбольшая. Са 184 учарашніх студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў, цяпер беспрацоўных, права на сацыяльную дапамогу заканадаўча маюць толькі 162. Найцяжэй знайсці работу ў Мінску.

— *А як ідуць справы з прафесіямі, што выкладаюцца ў БДУ?*

— Летась да нас часцей з выпускнікоў БДУ звярталіся настаўнікі рускай мовы і літаратуры, гісторыкі, матэматыкі, фізікі. З іншых спецыяльнасцей складана працаўладкавацца эканамістам, фізікам-радыётэхнікам, электроншчыкам, тэхнолагам, праграмістам. Наогул вакансій для ІТР вельмі і вельмі мала, асабліва ў Мінску. Напрыклад, эканамістаў у нас зарэгістравана ў 3 разы больш, чым вакансій.

— *Як журналіст, карыстаючыся выпадкам, не магу не запытаць пра лёс заўтрашніх маіх калег?*

— Пакуль беспрацоўных журналістаў не зарэгістравана. Але ў сувязі з даволі рэзкім ростам цэн на паперу і паліграфічныя паслугі многія газетныя выданні акажуцца на мяжы банкруцтва, і будучае журналістыкі не зусім бясхмарнае. Цяжкасці з працаўладкаваннем рэальныя ў будучым.

— *Якая сёння найбольш «надзейная» прафесія?*

— Пэўна, бухгалтар. Асабліва частыя заяўкі на галоўнага бухгалтара. У сельскай мясцовасці па-ранейшаму шмат вакансій аграномаў, заатэхнікаў, ветэрынараў. Не хапае медыкаў, настаўнікаў, многіх іншых спецыялістаў у Магілёўскай і Гомельскай абласцях.

— *Ваш прагноз на 1992 год?*

— У нас сёння непрадказуемая эканоміка, і не рызыкну выказваць свае назіранні. Аднак усе разумеюць, што цяжкасці нашы, у тым ліку і з працаўладкаваннем, узмацняюцца.

— Магчыма, іншым са студэнтаў варта падумаць аб змене профілю?

— Катэгарычна «мяняць» я б раіла ўжо адразу дзяўчатам, якія вучацца на інжынера-механіка, інжынера-будаўніка, інжынера-геадэзіста, інжынера-дарожніка ці на іншыя нежаночыя прафесіі. Уладкавацца ў НДІ, у «цёплыя» кабінеты на кіруючыя пасады сёння для іх практычна немагчыма, а на аб'екты, на трасу або ў механічную майстэрню — што там жанчынам рабіць? Адназначна раю выпускнікам не браць даведку на самастойнае працаўладкаванне, а ісці па размеркаванню, бо ў выніку ўсе «самастойныя» потым прыходзяць да нас. Памятайце, грашовая дапамога выдаецца ў выключных абставінах, зусім не кожнаму беспрацоўнаму. Найлепшы варыянт — вучоба на дагаворнай аснове з прадпрыемствам, установай. Ну, а наш Цэнтр можа гарантаваць толькі зацікаўлены, добразычлівы ўдзел у вашых праблемах, калі яны ўзніклі.

— *Поспехаў вам у дапамозе ўсім нам!*

А. ЦЯРЭНЦЬЕВА.

ШТО З ВОЗА...

Пакой № 4

Па адрасу Бабруйская, 9, пакой 4 адчыніў дзверы пункт рэалізацыі нявыкарыстанага абсталявання, прыбораў і камплектуючых вырабаў «Зрабі сам».

Яўген Данілавіч Качкарык, зараз старшыня камісіі па ўцэнцы таго, што рэалізуюць у пакоі № 4, доўгі час не мог згадзіцца з тым, што «курочаць» спісаную апаратуру кафедр БДУ.

Яўген Данілавіч заняўся такой гэхнікай, у выніку чаго з'явіўся «пункт збору» ў падвальным памяшканні. Туды пачалі сцякацца аджыўшыя свой век прыборы, абсталяванне.

Кафедры універсітэта прыкладна на 80 працэнтаў абсталяваны прыборамі выпуску 50—60-х гадоў. Трэба спісваць каля 5 тысяч адзінак абсталявання. «Калі прыбор не з'яўляецца каштоўнасцю, мы купляем яго як метал, а потым дэманціруем», — растлумачыў Яўген Данілавіч. Ён жа сцвярджае, што пункт набыў шматлікіх прыхільнікаў сярод выкладчыкаў і студэнтаў, у якіх стала адной магчымасцю больш набыць патрэбныя рэчы.

МЕХ З ПАДАРУНКАМІ



Навагоднім ці калядным падарункам ад бухгалтэрыі можна лічыць складзены тут новы графік атрымання стыпендый. Ёсць надзея, што ён будзе больш пільна эканоміць час студэнтаў і аспірантаў, у тым ліку час на святкаванні.

Аспіранты ўсіх факультэтаў цяпер будуць атрымліваць стыпендыю ў касе № 1 з 15 да 17 числа кожнага месяца. Гэта ж самая каса будзе абслугоўваць 15 числа філолагаў, а 16-га — гісторыкаў і фізікаў.

Студэнтам факультэта радыёфізікі і электронікі належыць прыходзіць за стыпендыяй 15 числа кожнага месяца ў касу № 2, 16-га сюды ж — юрыстам і геаграфам, а 17-га — журналістам.

Касір касы № 3 будзе выдаваць грошы студэнтам факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі і біёлагам — 15 числа кожнага месяца, студэнтам мехмата і хімфака — 16-га, а тым, хто вучыцца на філасофска-эканамічным факультэце, — 17-га.

Ёсць адна агульная заўвага для ўсіх. Калі 15-е чысло будзе прыпадаць на суботу, выплата стыпендый будзе пачынацца на два дні пазней для студэнтаў і аспірантаў усіх факультэтаў, чым указана ў графіку, а калі 15-га — нядзеля, графік «рухаецца» на адзін дзень наперад.

Новы год — гэта цудоўна! Год Малпы — неверагодна цікава! Толькі не спяшайцеся зазіраць пад елку. Асабліва небяспечна перадаваць гэтую шкодную звычку дзецям. Сёлетні Дзед Мароз не такі ўжо багаты на падарункі. Не спрыяе яму і рыначная эканоміка, якая ніяк не праціснецца праз дзіркі эканомікі цяперашняй.

Вось і рэдакцыйныя падарункі маюць сціплы выгляд. Што зробіш — дэфіцыт. Спадзяемся на адно: чытач нас апраўдае. Тым больш, што «Мех з падарункамі» — не адзіная старонка ў газеце...

ЗА НОВЫ БЫТ

Не падмажаш — не пралезеш

Студэнты хімфака, пэўна, і самі не чакалі стаць ільготнікамі — мець права абслугоўвацца па-за чаргой у гадзіннікавай майстэрні, што знаходзіцца побач з хімічным корпусам...

Праўда, як высветлілася, не ўсе студэнты, а толькі тыя, хто прыносіць у майстэрню дэфіцытныя хімікаты — гексан, спірт і бюксы. А іх пакуль не шмат. Можа таму, што астатнія не ведаюць пра магчымасць атрымання прывілей адразу за дзвярыма роднага факультэта?

Прапаную майстрам гадзіннікаў зрабіць папраўку ў паперцы, адрасаванай хімікам, і напісаць так: «Ільготы на абслугоўванне ў нашай майстэрні маюць толькі «блатныя» студэнты хімічнага факультэта БДУ».

А. ГУСАК.

АПОШНЯЯ ТАЯМНІЦА ГОДА

ПРАВАКАТАРЫ

Незадоўга да 1917 года ў краінах Еўропы накапілася каля пяці тысяч палітычных эмігрантаў з Расіі. У асноўным гэта былі мацёрыя праціўнікі царскага рэжыму з ліку «вечных» студэнтаў, няўдалых гандляроў, равінаў, якія не давучыліся. Большасць з іх не займаліся грамадска-карыснай працай, час бавілі весела, збіраючыся на свае сходы, і не грэбавалі атрымліваць грошы з любых крыніц, нават самых неахайных. Магчыма, дэпартамент паліцыі не звярнуў бы асаблівай увагі на дзейнасць гэтай групкі ворагаў Расіі, калі б рэвалюцыянеры не засылалі ў імперыю платных забойцаў і злачынцаў. Тут і там гінулі ад бомбаў і рэвальверных куляў грамадскія і дзяржаўныя дзеячы, за што арганізатары і выканаўцы забойстваў атрымлівалі ад буржуазіі і кіраўнікоў сіяністскага руху вялікія сумы. Несумненна, дэпартамент паліцыі не пакідаў іх паза ўвагай. Асноўнымі пастаўшчыкамі аператыўнай інфармацыі аб дзейнасці і прымаемых партыямі рашэннях з'яўляліся платныя агенты з ліку саміх жа рэвалюцыянераў.

Па заявах вышэйшых чыноў паліцыі ў партыі сацыялістаў рэвалюцыянераў кожны другі быў платным інфарматарам, а ў сацыял-дэмакратаў — кожны трэці.

На ўтрыманне інфарматараў царскі ўрад грошай не шкадаваў. Дастаткова зазначыць, што адзін з лідэраў партыі эсераў Еўно АЗЭФ атрымаў у дэпартаменце паліцыі жалаванне, якое было большым за жалаванне царскага міністра. Адначасова ён атрымліваў мільёны ад яўрэйскіх суполак у Англіі, Амерыцы, Германіі, Францыі і іншых краінах за арганізацыю забойстваў праціўнікаў сіянізма.

У рускай паліцыі было нямала людзей, якія абураліся правакатарскай дзейнасцю інфарматараў, якія спачатку арганізоўвалі тэракты, а потым самі ж і выдавалі паліцыі выканаўцаў, нажываючы на жыццях маладых людзей вялікія капіталы.

Нярэдка, рызыкуючы ўласным жыццём, паліцэйскія паведамлялі рэвалюцыянерам аб здрадніках. Самыя адчувальныя ўдары па інфарматарах нанеслі Міхаіл Банай і Леанід Меншчыкаў, якія перайшлі на бок рэвалюцыянераў. Яны выдалі больш за 400 тайных агентаў царскай паліцыі, чым нанеслі непапраўны ўрон усяму палітычнаму вышуку. А былы дырэктар дэпартамента паліцыі А. Лапухін выдаў Е. Азэфа, за што быў асуджаны на пяць гадоў катаржных работ, якія цар замяніў высылкай.

Інфарматарства ў асяроддзі рэвалюцыянераў з'яўлялася найбольш эфектыўным сродкам барацьбы з імі. На патрабаванне дэпутатаў трымаць справаздачу аб дзейнасці тайнай паліцыі Старшыня Савета Міністраў П. Сталыпін, выступаючы ў Дзяржаўнай Думе, заявіў:

«Тут увесь час паўтараліся словы «правакатар», «правакацыя», каб у далейшым не было ніякіх непаразуменняў, я павінен зараз жа высвятліць, якое рознае разуменне гэтых паняццяў можа існаваць. Па рэвалюцыйнай тэрміналогіі кожная асоба, якая пастаўляе весткі ўраду, ёсць правакатар. У рэвалюцыйным асяроддзі такая асоба не будзе названа здраднікам, а будзе аб'яўлена правакатарам. Гэты прыём не падсвядомы, а вельмі выгадны для рэвалюцыі. Па-першае, амаль кожны рэвалюцыянер, якога выкрываюць ў злачыннай дзейнасці, звычайна заяўляе, што асоба, якая яго выкрыла, і ёсць правакатар, па-другое, правакацыя сама па сабе ёсць акт настолькі злачынны, што для рэвалюцыі мэтазгодна падвесці пад гэтае паняцце дзеянні кожнай асобы, якая судакранаецца за паліцыяй. А між тым урад павінен зусім адкрыта заявіць, што ён лічыць правакатарам толькі тую асобу, якая сама прымае на сябе ініцыятыву злачынства, прыцягваючы ў гэта злачынства трэціх асоб, якія ўступілі на гэты шлях па прымусу агента-правакатара...» П. Сталыпін таксама заявіў, што паліцыя не ўкараняе ў асяроддзе рэвалюцыянераў сваіх інфарматараў, наадварот, самі рэвалюцыянеры прапаноўваюць ёй свае паслугі.

Калі ў сакавіку 1917 года да Парыжа данесліся першыя весткі аб адрачэнні Мікалая II, перад актывістамі эміграцыі паўстала пытанне аб захаванні і захопе архіваў замежнай палітычнай паліцыі. Аднак па гарачых слядах захоп дакуметаў не ўдаўся і толькі пасля таго, як Часовы ўрад узначаліў Аляксандр Керанскі, эміграцкі камітэт атрымаў яго дазвол на разбор архіваў і выяўленне сакрэтных супрацоўнікаў дэпартамента за мяжой.

Члены камісіі спяшаліся вывучыць сакрэтныя паперы, шукалі прозвішчы агентаў. Але іх чакала расчараванне. Ніякіх прозвішчаў інфарматараў, а таксама намёка на іх знайсці не ўдалося. На данасах стаялі псеўданімы «Скос», «Расіні», «Сосі», «Карбо», «Ней», «Шарні» і гэтак далей, якія не давалі нават магчымасці вызначыць, хто хаваецца за імі — мужчына ці жанчына.

На дапамогу прыйшоў прафесіянал — вядомы выкрывальнік многіх інфарматараў Л. Меншчыкаў. У 1909 годзе ён тайна пераправіў за мяжу свае архівы і там пачаў выкрывальніцкую дзейнасць. Гэтым ён нанёс расійскай паліцыі больш адчувальны ўдар, чым усе рэвалюцыйныя партыі разам узятыя, пазбавіўшы дэпартамент шырокай інфармацыі на некалькі гадоў. З яго дапамогай частка агентаў была раскрыта. Трэба адзначыць, што пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі спісы здраднікаў не публікаваліся. Але правакатары дзейнічалі не толькі за мяжой. Вялікая іх колькасць інфармавала дэпартамент унутры імперыі. Каб мець уяўленне, як аплочвалася супрацоўніцтва з паліцыяй, дастаткова адзначыць, што ў сярэднім рабочы атрымліваў тады 30 рублёў у месяц, інфарматар — сотні і тысячы.

Асноўныя правакатары засталіся нераскрытымі, асабліва сярод бальшавікоў, якія закрылі ўсе архівы, як толькі прыйшлі да ўлады.

(«Дойчэ Трыбуне»)
Пераклаў з нямецкай
А. ГУСАК.

Паедзем у вёску святкаваць Каляды? Нават калі зіма не падорыць нам у гэтыя дні снегу, нават калі (крый, Божа) Новы год прыйдзе да нас па лужынах — паедзем! Не атрымаецца — успомнім хаця б, як сустракалі раней Каляды беларускія сяляне. У сённяшнім горадзе большасць з іх традыцый наўрад ці прыжывуцца, але тое-сёе вельмі падыходзіць і для нашага часу.

Беларускія Каляды (7—19 студзеня адзначаліся яны раней) адпавядаюць заходнееўрапейскаму «рождеству». Яны адкрывалі гадавы цыкл земляробчых святаў. Сімвалічна, што калядаванне прыходзілася на той час, калі пасля зімовага сонцастаяння светавы дзень пачынаў павялічвацца.

ДЗЕ КАЗА ХОДЗІЦЬ

ОЙ, КАЛЯДАЧКІ, ВЫ Б ХУТЧЭЙ, ХУТЧЭЙ!

Па разнастайных прыкметах, якія суправаджалі Каляды, сяляне вызначалі будучы ўраджай, імкнуліся паспрыяць дабрабыту сваёй сям'і, адвесці хваробы і калецтвы ад сваякоў і жывёлы. Свае лепшыя думкі і мары звязвалі з Калядамі хлопцы і дзяўчаты. Іх вельмі чакалі і дзеці.

Рыхтаваліся да гэтага свята ў беларускай вёсцы загадзя. Кожная сям'я забяспечвала сябе пачастункамі. За два тыдні да Каляд сяляне пачыналі таўчы ў ступах ячмень і назапашваць крупы, каб іх хапіла на ўсе дні свята. Больш заможныя гаспадары павінны былі падзяліцца з бяднейшымі. І ў вёсцы, і ў горадзе гаспадыні старанна прыбіралі ў хаце, наводзячы ўзорную чысціню. Пры гэтым развітваліся са старымі, непатрэбнымі рэчамі, што было сімвалам абнаўлення свету.

Абавязковай абрадавай стравай была куцця, якую напярэдадні гатавалі з мёдам ці алеем; перад Новым годам, на Васілле — багатую, тлустую, з мясам і салам; у канцы святаў, перад Вадохрышчам — зноў посную, галодную, вадзяную.

У першы дзень Каляд, вечарам, уся сям'я павінна была сабрацца ў хаце разам. Маладыя жанчыны, якія нядаўна выйшлі замуж, прыходзілі вячэраць у родную сям'ю. У гэты вечар было прынята частку страў пакідаць нябожчыкам. За сталом строга прытрымліваліся пэўнага этыкету: усе члены сям'і сядзела на строга вызначаных месцах, захоўвалася чарговасць падачы страў, выконваліся разнастайныя магічныя дзеянні, накіраваныя на забеспячэнне добрага ўраджаю. Гаспадар больш клапаціўся аб ураджаі жыта, пшаніцы, ячменю, гаспадыня — аб ураджаі агуркоў, капусты, морквы.

У першы дзень свята панаваў звычай да ўзыходу сонца віць вяроўкі і аблытваць імі стол у хаце, каб летам коні не разбягаліся і не рабілі шкоды на лугах і засеяных палях.

У першы дзень Каляд сяляне стараліся не хадзіць да суседзяў, што, быццам бы, спрыяла таму, каб жывёла не збягала са двара і не прападала.

На працягу ўсяго свята гаспадыні не выкідвалі смецце на сметнік, а складвалі яго ў жлукту і выносілі на балота (каб у градах не было пустазелля).

Моладзь майстравала да свята разнастайныя маскі. Хлопцы і дзяўчаты ўтваралі гурт, у якім самымі важнымі персанажамі былі каза, мядзведзь, конь і бусел. Іх вадзілі па вёсцы калядныя дзяды і цыганы. Дзедам, як правіла, абіраўся самы вясёлы і дасціпны хлопец, які вёў увесь абрад, напамінаў гаспадарам аб неабходнасці адорваць калядоўшчыкаў. Яны абыходзілі ўсе хаты ў сваёй вёсцы. Нельга было прапусціць ніводнай сядзібы, бо гэта было праявай страшэннай непавагі да сям'і.

Удзельнікі каляднага гурту спявалі віншавальныя, велічальныя песні гаспадарам, іх дзецям, жадаючы шчасця, здароўя, багатага ўраджаю. Пасля песень пачыналася тэатральнае дзеянне: цыган прапаноўваў купіць у яго каня, цыганка гадала, прадказваючы ўсім шчаслівы лёс, каза валілася на падлогу, а дзед прасіў гаспадароў падкарміць яе (бо каза самлела ад голаду). Гаспадары шчодра адорвалі калядоўшчыкаў — скупасцю можна было наклікаць на сябе розныя няшчасці.

Абышоўшы ўсе сядзібы ў вёсцы, маладыя ўдзельнікі каляднага гурту збіраліся ў вялікай хаце, дзе гулянне працягвалася, са скокамі, песнямі, гульнямі, смешнымі і жудаснымі гісторыямі ў перапынках.

Святочныя вячоркі хлопцы і дзяўчаты ладзілі кожны вечар на працягу Каляд, часта ў карчме. Гэта былі своеасаблівыя агляды патэнцыяльных жаніхоў і нявест, таму ўсе прыходзілі ў сваіх лепшых уборах.

Хлопцам адводзілася больш адказная роля. Яны збіралі грошы на частаванне і музыкантаў, дамаўляліся наконт месца, а пасля з крыкамі і песнямі, у суправаджэнні гурту дзяцей накіроўваліся да абранага месца. Наладжвалася невялікае частаванне, а потым хлопцы ішлі запрашаць на свята дзяўчат. Лічылася непрыстойным для дзяўчыны ісці на святочныя гулянні без запрашэння. Выключэнне рабілася толькі для дзяўчынак-падлеткаў. Найбольш папулярнымі танцамі былі полька і кадрыля, а таксама вальс, мазурка, кракавяк.

А яшчэ нашы продкі, святкуючы навагодняе свята, не забываліся на табу: ім забаранялася сварыцца, лаяцца, успамінаць пра смерць, рабіць ганебныя ўчынкі. Вельмі былі б дарэчы гэтыя табу нам сёння.

Тое-сёе пра гаспадыню

Малпа — істота непаслухмяная, жвавая, задзірлівая, гарэзлівая, нарэшце, непрадказуемая. Яна жартаўлівая, вясёлая, умее і любіць падабацца, з кожным можа знайсці кантакт, горача любіць пацехі; яна вынаходлівая, валодае прагай да ведаў і незвычайнай памяццю. Пры гэтым — няма ружы без калючак! — славалюбная і эгаістычная, астывае да любой справы так хутка, як і «запальваецца» ёй. Чалавек, народжаны пад гэтым знакам, можа лёгка, вельмі хутка вырашыць самыя складаныя праблемы... калі будзе дзейнічаць неадкладна: маленькае прамаруджванне — і цікавасць страчана, ідэя забытая, работа закінутая...

У Малпы вострый розум... і фантастычная здольнасць «пускаць пыл у вочы». Яна такая ўмелая, што можа абвесці вакол пальца нават Дракона — моцнага, разумнага, смелага. Яна не баіцца і Тыгра, якога дражніць нелітасціва.

Яна дыпламатычная, хітрая, свавольная, часам неразборлівая ў сродках для дасягнення мэты, але пры гэтым заўсёды такая разумная і чароўная, што мы не ў сілах ёй працівіцца. Там, дзе патрабуецца дасціпнасць і пранікліваць, лепшага партнёра на знайсці!

Няма прафесіі, закрытай для народжанага пад гэтым знакам: палітыка, дыпламатыя, індустрыя, гандаль — нідзе для іх няма сакрэтаў, усё засвояць, на любой ніве дасягнуць поспехаў!



Ганіце яго прэч

Ф. ФРЫМЕН

— Дык што вас непакоіць? — сказаў доктар Ленко. — Я не зусім разумею.

Мервін Хінклі адчыніў ужо рот, але раптам замер і зацкаваным позіркам абвёў усе вуглы раскошна абстаўленага кабінета псіхіятра.

— Вельмі цяжка апісаць... — запінаючыся, вымавіў Мервін. — Мне трэба ўражвацца ад яго... Трэба ад яго ўражвацца...

Доктар Ленко больш зручна ўсеўся ў глыбокім скураным крэсле і, хутка прагледзеўшы стос папер на стале, выбраў маленькае пісьмо:

— Вы паведамляеце, што вас праследуе нейкая здань?

Мервін з адчаем схапіўся за светла-каштаваныя валасы.

— Гэта не здань! Яна рэальная! Я бачу яго кожны вечар роўна ў дзесяць — вялікае, у лусцэ, з вялізнымі чырвонымі вачыма!

Ён з жахам агледзеўся, быццам адно апісанне магло выклікаць страшыдла да жыцця. Потым з цяжкасцю прымусіў сябе апусціцца на крэсла і, сціснуўшы кулакі, узбуджана ўтаропіўся ў доктара.

— Есць адзін просты прыём, — спакойна сказаў доктар.

— Які?

— Ганіце яго прэч, містэр Хінклі. Ганіце яго прэч, — доктар Ленко пакінуў крэсла і падышоў да Мервіна. — Хай сабе гэта няпроста. Але гэта псіхалагічна абгрунтаваны метад пазбаўлення ад такіх кашмараў. Вам трэба пераканаць сябе, што вы не верыце ні ў якое такое стварэнне з луской і вачыма. Загадайце яму — у думках! — пайсці. І яго знікне. Усё залежыць ад вашай рашучасці і сілы волі. — Урач абышоў вакол стала і сеў. — Ганіце яго прэч. Я мяркую, у вас атрымаецца. Рызыкніце. Сёння ж увечары.

...Доктар Ленко меў звычку класціся спаць рана, але надыходзячы сон разагнаў тэлефонны званок.

— Гэта Мервін Хінклі! — узбуджана залапатаў голас у трубцы. — Не мог не пазваніць вам. Страшыдла...

— Ну што? — незадаволена прабурчэў Ленко, рыхтуючыся да сеансу дыстанцыйнай тэрапіі.

— Атрымалася! — гаркнуў Мервін. — Я прагнаў яго, доктар. Ужо чвэрць адзінацатага, а яго няма. Цуд.

— Цуд... — пазяхнуў урач. — Калі я вам яшчэ калінебудзь спатрэблюся, тэлефануйце.

Абрываючы размову, ён паклаў трубку. Праз хвіліну ў галавах койкі пачуўся шум. Доктар расплюшчыў вочы. Страшыдла было высокім, усё пакрытае луской, яно бліскала чырвонымі вачыма.

— Ш-ш-ш, — выдавіў з сябе доктар.

— Выбачайце, — сціпла пасміхнулася страшыдла. — Спадзяюся, я вас не патурбаваў? Мяне даслаў Мервін...

Прывітанне, малпачка!

У надыходзячага 1992 года два магутныя астралагічныя апекуны — белатвары Месяц і гарэза, свавольніца Малпачка. Варта пастарацца дагадзіць абодвум.

Апранемся на радасць Месяцу ў навагоднюю ноч у адзенне простага пакрою, белага ці светлага колеру з ільнянога, баваўнянага ці тонкага шарсцянога палатна. А для пацехі Малпы ўпрыгожым убранне бліскучымі яркімі пацеркамі, прыкметнымі, кідкімі бранзалетамі, завушніцамі «пад золата» буйных памераў.

Няхай у святочную ноч адзінай крыніцай святла будуць маленькія рознакаляровыя лямпачкі на елцы, не пажадана запальваць нават свечкі: Месяц не церпіць сапернікаў, а Малпа цудоўна бачыць і ў паўзмроку.

Пахі — толькі натуральныя, елкі і кветак. Калі карыстацца духамі, то тымі, якія дыхаюць свежасцю.

Месяцу будуць да душы меладычныя песні, плаўны вальс. Яны могуць чаргавацца з агнявымі, тэмпераментнымі танцамі — пад густ Малпачкі.

Што паставіць на стол? Найперш, стравы хатняга прыгатавання: апетытныя пірагі, ватрушкі, розныя варэнні, саленні, морсы... Мяса не трэба, абодвы апекуны Новага года — вегетарыянцы. (Калі вы ніяк не можаце без яго абысціся, прыгатуйце больш прымальныя стравы — з курыцы, качкі ці гуся). Любімы пачастунак Малпы — бананы — з поспехам заменіць іх беларускі варыянт, бульба ў розных відах. Варта папярэдзіць, што Малпа здольна пусціцца на жартаўлівае падбухторванне да злоўжывання спіртным. Гэта яе звычайныя выбрыкі, з якімі мы яшчэ не аднойчы сутыкнемся.

ТВАРЫ САБЕ КУМІРА

На святочны стол прынята таксама ставіць астралагічны знак-сімвал надыходзячага года. Лепш зрабіць яго сваімі рукамі. «Свая» малпачка атрымаецца больш сімпатычная і больш здольная прынесці шчасце... Пашыць яе можна з кавалкаў футра альбо тоўстай тканіны, лепш букліраванай. Яшчэ спатрэбіцца мяккі дрот для каркаса і вата, каб «набіць» фігурку. Для мордачкі падыдзе скура або замша ад старой сумкі ці пальчатак (на крайні выпадак, любая тоўстая тканіна ці нават папера). Дэталі выкрайкі дадзены ў натуральную велічыню. Калі вы зробіце каркас з мяккага дроту, малпачку можна будзе пасадзіць, падняць ёй лапкі і г. д. Памеры можаце павялічыць ці зменшыць, можаце нават зрабіць малпачку-брошку на сукенку.

Найлепшы для асновы — карычневы колер, для мордачкі — бэжавы, аднак можна і іншы: сіні, зялёны, аранжавы. Трэба выкраіць па дзве дэталі тулава і галавы. Дэталі тулава складваем лепшым бокам усярэдзіну і прастрочваем, пакідаючы невялікі ўчастак, каб потым можна было вывярнуць. Дэталі галавы таксама складваем лепшым бокам усярэдзіну і паміж імі ўкладваем вушы (яны павінны глядзець унутр), злучаем адным швом, пакідаючы невялікі ўчастак незастрочаным. Дэталі вываручваем, набіваем ватай і сшываем.

Бяром дрот даўжынёй 32 см для рук, 36 см — для ног і 24 см — для хваста. Праколваем дрот праз тулава ў месцах, якія паказаны на чарцяжы пункцірам. Сачыце, каб з усіх бакоў даўжыня дроту была аднолькавай. Дрот перагібаем удвая і канечык замацоўваем ля асновы, зрабіўшы невялікі кручок.

Цяпер пашыем адзенне для рук, ног і хваста, пакінуўшы адзін вузкі канец незашытым. Вывернем дэталі і «надзенем» каркас. Незашытыя канцы прышыем да тулава. (Калі малпачка маленькая, дэталі тулава і галавы можна звязаць кручком слупкамі без накіда, а ручкі, ножкі і хвост туга абгарнуць той жа шарсцяной тканінай).

Цяпер робім мордачку. Выразаныя дэталі наклейваем на тканіну галавы. Калі гэта футра, яго трэба каротка падстрыгчы. Прыклейваем вочы, малюем нос і рот.

Можна зрабіць вашай малпачцы «матроску» або палаcатыя штаны, або варатнік веерам, або... Словам, усё, што падкажа ваша фантазія.



ПРАГНОЗ НА...

На Глобу спадзявайся,

Павел ГЛОБА, дырэктар астралагічнага цэнтра пры прэзідыуме Акадэміі навук СССР, прадказаў многія падзеі, якія потым нам давялося перажыць. Сёння ж яны развіваюцца з незвычайнай хуткасцю. Што ж чакае нас у будучым?

— Урады робяць адну памылку за другой, і, калі не здолеюць неяк выправіць становішча да канца снежня, можа, на жаль, сфарміруецца яшчэ адна змова — на гэты раз ужо чыста ваенная. Недзе ў канцы лютага — пачатку — сакавіка магчымы сур'ёзны пераварот і грамадзянская вайна. Гэта не будзе іншая перамога дыктатуры, але вайна ўсіх супраць усіх з хаосам і канчатковым распадам усёй былой сістэмы Саюза.

Беспрацоўе дасягне 40—50 працэнтаў, на вуліцы выйдуць масы галодных беспрацоўных. З'явяцца шматлікія бандфарміраванні.

Толькі ў канцы 1994 года пачнецца выхад з тупіка, у год Блакітнай сабакі па ўсходняму календару. А пакуль згодна з ім жа два чорных года — Чорнай малпы і Чорнага пеўня. Яны будуць жудаснымі для нас — я называю гэта палётам над безданню. Для правіцеляў надыходзіць найбольш складаны час. Між тым, Гарбачоў здолее выкруціцца, а вось Ельцын наўрад ці.

Што датычыцца Беларусі, яна прачнецца ў наступным годзе. У яе з'явяцца новыя лідэры, якія будуць весці яе. Для гэтага патрэбна, каб чорны месяц выйшаў з Казерога — здарыцца гэта зімой. Вось зімой гэтыя лідэры ці лідэр павінны «высвеціцца».

Дацягнуць да года Блакітнай сабакі

НАСУПЕРАК ЗМРОЧНЫМ ПРАГНОЗАМ

СТАЦЬ ЧЭМПІЁНАМ СВАЙГО ЖЫЦЦЯ

МАГЧЫМА, КАЛІ ПРАЙСЦІ КУРС НАВУЧАННЯ Ў ШКОЛЕ ПСІХАТВОРЧАСЦІ

Калі вы сур'ёзны чалавек, то рана ці позна пачынаеце разумець: сёння, каб не проста выжыць, але жыць добра, адной дзелавой хваткі і размаху мала. Трэба нешта ведаць і ўмець.

І вось хачу пазнаёміць вас са сваім субяседнікам. Кіраўнік Школы псіхатворчасці, кандыдат педагагічных навук, дацэнт М. Л. ЖАРЫКАЎ.

— Мікалай Леанідавіч, растлумачце, калі ласка, што азначае такое «чэпіёнства»?

— Здольнасць да самаразвіцця. Пастаяннае пашырэнне межаў асабістых магчымасцей. Уменне адшукваць тыя бязмежныя рэзервы, якія схаваны ў нашай псіхіцы, і эфектыўна выкарыстоўваць іх для вырашэння жыццёвых праблем ці тых задач, якія чалавек сам ставіць перад сабой.

— Напрыклад?

— Паспяхова супрацьстаяць розным стрэсам, хутка аднаўляцца пасля любых нагрузак, кіраваць сном, здымаць боль, паляпшаць памяць, узмацніць рухальны патэнцыял, засвоіць любую новую справу, раскрыць і развіць свае творчыя магчымасці.

— І ўсяму гэтаму можна навучыцца ў вашай школе за 5—6 заняткаў?

— За гэты час мы даём базавы экспрэс-курс, на працягу якога вучань авалодвае галоўным — тым, што мы называем супернавыкам псіхатворчасці.

— Гучна.

— Гучна не толькі гучыць. Гэта асаблівы, не пабаюся гэтага слова, унікальны навык самаарганізацыі і самарэгуляцыі, які дазваляе чалавеку ажыццявіць «прарыў» у сваім развіцці.

— Так і хочацца спытаць: а як гэта?

— Адказаць значна складаней. Для гэтага трэба было б раскрыць складанае паняцце «псіхічная сінгулярнасць», адно з самых важных у нашай сістэме. Паспрабую ў двух словах.

У любым з нас закладзены нейкі пачаткова нейтральны ў адносінах да часу і прасторы стан псіхікі — стан «чыстага аркуша». Ён валодае магутным псіхаэнергетычным патэнцыялам і абвостранай успрымальнасцю да любых устаноўак і саманамоў. Але ў звычайных умовах свядомасць чалавека «забруджана» рознымі псіхалагічнымі «шумамі», што не дазваляе яму самастойна прабіцца на ўзровень «чыстага аркуша» і выкарыстаць свае ўнутраныя рэзервы. Ды й часта мы проста не падазраем, што гэта магчыма.

Выходзіць, навучанне гэтаму не толькі магчыма, але можа быць хуткім і даволі простым, ва ўсялякім разе, для вучня. Гэта якраз і ўваходзіць у задачу таго базавага курса, аб якім мы гаварылі. У цэлым жа сістэма псіхатворчасці ўяўляе сабой універсальную тэхналогію выхаду на экстрамагчымасці чалавека ў любой галіне — ад асабістага здароўя да вышэйшых форм прафесійнай дзейнасці. Адпаведна могуць стварацца і розныя праграмы, у тым ліку і па тэрмінах навучання.

— Вопыт апошніх гадоў навучыў усіх нас падыходзіць больш асцярожна да такіх «шматабяцаючых» сістэм. Грамадства ўжо перажыла бум захаплення ёгай, аўтатрэнінгам і іншымі моднымі сістэмамі. Чым адрозніваецца ваша, скажам, ад таго ж аўтатрэнінгу?

— Перш за ўсё хуткасцю, з якой дасягаецца станоўчы эфект. У класічным аўтатрэнінгу для таго, каб авалодаць навыкам самарэгуляцыі, трэба доўга і рэгулярна працаваць, таму нярэдка чалавек кідае заняткі, не дасягнуўшы нейкіх адчувальных вынікаў. У нашай методыцы, наадварот, навык фарміруецца адразу, і вынік вы адчуеце ўжо непасрэдна ў працэсе заняткаў.

Акрамя таго, расслабленне — аднаўленне для нас толькі пабочнае ўменне. Галоўнае — мы дапамагаем чалавеку развіць свае здольнасці. Ствараецца своеасаблівы «творчы генератар», які вы зможаце падключаць да любой практычнай дзейнасці і адаптіраваць сваю псіхіку ў прымяненні да самых розных сфер вашых інтарэсаў. З'яўляецца патрэба ў пастаянным самаразвіцці.

— Усе людзі такія розныя... Дык няўжо магчыма на працягу некалькіх заняткаў кожнаму стаць «Чэмпіёнам Асабістага Жыцця»?

— Важна, каб нашы патэнцыяльныя вучні (такім можа стаць любы) разумелі наступнае: больш значным будзе зрух у таго, каму ён больш неабходны, і ў тым напрамку, які чалавека больш цікавіць. Вось, скажам, прыходзіць хворая, слабая дзяўчына. «Вельмі хачу стаць моцнай. Спрабую адціскацца рукамі ад падлогі, але не магу нават крыху ўзняцца». Уявіце, што ўжо на наступны пасля заняткаў дзень яна паведаміла, што здолела адціснуцца

пяць разоў! Прычым, заўважце, усё адбылося без умяшання нейкіх магаў, ведзьмакоў, экстрасенсаў.

Але не трэба забываць: у кожнага чалавека свае стартавыя пазіцыі і, адпаведна, у кожнага свая планка вышыні. Любы будзе рухацца наперад, але не ўсе на адну і тую ж дыстанцыю. Некаму трэба прымушаць сябе бегаць, нехта не можа пазбавіцца ад спакусы паесці. Для такіх людзей і гэта праблема. А для кагосьці такія праблемы смешныя. Але і той, хто ўпершыню за многія гады не будзе есці перад сном, і той, хто выпрацуе ў сябе, скажам, талент мастака — кожны нешта пераможа ў сабе.

— Я выкарыстала набыты навык, каб вывучыць замежную мову. Вывучыла. А што далей?

— Не выпадкова мы называем яго супернавыкам ці навыкам навыкаў. Мне ўсё роўна, з якой менавіта мэтай вы да мяне звярнуліся. Галоўнае тое, што яна ў вас ёсць. І ў гэтым сэнсе вашу ўстаноўку на мову можна разглядаць як нагоду для працы. Механізм жа закладваецца універсальны. Вы атрымліваеце здольнасць, якую можна выкарыстаць дзе магчыма і развіваць у любым напрамку.

Гэтыя навыкі даюцца аднойчы і назаўсёды ці неабходны далейшыя заняткі?

— Уменне даецца аднойчы і назаўсёды. У тым сэнсе, што яно нікуды не знікае. Вы атрымаеце ключ да сваёй псіхікі. Але ключ гэты не павінен іржавець! Для замацавання поспеху неабходны самастойныя заняткі.

— Як трапіць у вашу школу?

— Звяртацца можна на адрас: Мінск, вул. Камуністычная, 86. Аб'яднанне пазашкольных устаноў Цэнтральнага раёна. Школа псіхатворчасці, Даведкі па тэлефоне 34-13-08.

Гутарыла
В. ПАЎЛАВА.

ПАРАДА

Не пілуйце апілоўкі

Спецыялісты суцяшаюць нас тым, што з будучага года цэны на харчовыя прадукты паднімуцца толькі ў 3—4 разы. Згодна з папярэднімі разлікамі, кілаграм мяса будзе каштаваць у сярэднім 40 рублёў, літр малака — 2,5 рублі, кілаграм сыру — каля 30, каўбасы вараной — 45, паўвэнджанай — 60, цвёрдага вэнджання — больш ста рублёў, кілаграм цукру — 8, сметанковага масла — больш чым 50 рублёў, дзесятак яек — 6, бутэлька гарэлкі — каля 50 рублёў. Цэны на хлеб павялічацца ў сярэднім у чатыры разы. Плата за кватэру і камунальныя паслугі падаражаюць прыкладна ў 6 разоў, адзін кілават электраэнергіі будзе каштаваць 16 капеек, прычым і ў горадзе, і ў вёсцы. Кошт транспартных паслуг павялічыцца таксама ў некалькі разоў.

Не трэба быць прафесарам псіхалогіі, каб зразумець, чым пагражае такі калядны «падарунак» нашаму знявечанаму грамадству. Але мы прызапасілі для вас самыя танныя лекі на зямлі — парады.

Каб не зважаць на бытавыя цяжкасці,

— будзьце занятымі. Чалавек, які пакутуе ад непакою, павінен поўнасцю забыцца ў рабоце, інакш ён высахне ад адчаю;

— не дазваляйце сабе непакоіцца з-за дробязей, якія трэба зневажаць і забываць. Помніце, што «жыццё занадта кароткае, каб разменьвацца на дробязі»;

— перш чым біць трывогу, вывучыце факты. Спытайце сябе: «Якія шанцы па закону вялікіх лічбаў, што здарэнне, з-за якога я непакоюся, калі-небудзь адбудзецца?»;

— а калі з'ява, як павышэнне цэн, непазбежная, лічыцеся з непазбежным;

— калі перад вамі ўзнікае спакуса працягваць упарціцца ў безнадзейнай справе, спыніцеся, задайце сабе тры пытанні: «Як многа тое, аб чым я непакоюся, значыць у маім жыцці?», «На якім узроўні мне трэба ўстанавіць «абмежавальнік» на гэтым непакоі, каб забыцца на яго?», «Ці не заплацій я ўжо больш, чым справа каштуе?»;

— няхай мінулае хавае сваіх мерцвякоў. Не пілуйце апілоўкі.

сам не паддавайся!

СУЦЯШАЛЬНАЕ

СТАРЫЯ НОВЫЯ СВЯТЫ

Больш не знойдзем мы ў календарах чырвоных лісткоў 7—8 лістапада і 7 кастрычніка — развіталіся з гэтымі святамі і афіцыйна. Але з пункту гледжання колькасці выхадных наша жыццё не стане ў будучым менш святочным. Зноў успомнім, што 25 снежня святкуюцца каталіцкія Каляды, а 7 студзеня — праваслаўныя, нагадаем, калі адзначаецца праваслаўная, а калі каталіцкая Пасха (акрамя адпаведнай нядзелі, яшчэ і ў наступны панядзелак), калі — Радуніца, Дзень памяці продкаў (Дзяды, 2 лістапада), Дзень незалежнасці (27 ліпеня). Застануцца з намі і нашы старыя знаёмыя — Новы год, 8 Сакавіка, Дзень працы (1 мая) і Дзень Перамогі (9 мая).

Калі мы яшчэ і ўспомнім, як святкавалі такія падзеі ў лепшыя часы, наша жыццё дакладна не паблякне.

Вядома, што з моманту нараджэння на нас уплываюць гадавыя рытмічныя вібрацыі, якія звязаны з септаграмай — сяміканцовай зоркай. У самых старажытных усходніх вучэннях сцвярджаецца, што «прынцып сямі» ляжыць у аснове любога працэсу, любой падзеі і якога б ні было дзеяння. Такім чынам, у адпаведнасці з сямігадовымі гадавымі рытмамі вы можаце вызначыць той агульны план, у межах якога вам і належыць дзейнічаць.

Першы год сямігадовага цыкла праходзіць пад знакам Марса: фізічная трываласць, умацаванне фізічнага здароўя, актыўнасць, барацьба. Другі год — пад знакам Сатурна: пазнанне свету з дапамогай спроб і памылак, падзенняў і ўдараў. Трэці год праходзіць пад знакам Мер-

Справа ў лічбе

курыя: актыўнае мысленне, развіццё і абвастрэнне прадпрымальніцтва, пашырэнне кантактаў, атрыманне новай інфармацыі. Чацвёрты — пад знакам Сонца: чалавек пераасэнсоўвае сябе, сваю індывідуальнасць, усведамляе сваё месца ў свеце. Пяты год — пад знакам Юпітэра: абвастрэнне псіхічнага ўспрымання навакольнага. Шосты год — пад знакам Луны: пачуццёвае ўспрыманне свету, развіццё інтуітыўных здольнасцей. Сёмы год — пад знакам Венеры: развіццё і абвастрэнне творчых здольнасцей, росквіт эмоцый. Сямігадовы цыкл заканчваецца, і пачынаецца новы. Значыць, пад знакам Венеры чалавек перажывае сёмы, чатырнаццаты, дваццаць восьмы, трыццаць пяты, сорак другі, сорак дзевяты і г. д. гады свайго жыцця.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 5 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

26 снежня
Зак. 2084—2085.
Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.